ДУА ”Сярэдняя школа №1 г.Сянно імя З.І.Азгура“

# Урок беларускай літаратуры ў 9 класе па тэме ”Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Жанравыя асаблівасці твора ”Пінская шляхта“

**Правяла: Сінкевіч Н.І.,**
**настаўнік беларускай мовы і літаратуры**

**Тэма ўрока:** Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Жанравыя асаблівасці твора ”Пінская шляхта “

**Мэта:** мяркуецца, што напрыканцы ўрока вучні будуць ведаць некаторыя факты з біяграфіі пісьменніка, асаблівасці жанру камедыі фарс-вадэвіль;

удасканаляць навыкі работы з рознымі інфармацыйнамі крыніцамі; зацікавяцца творчай спадчынай пісьменніка.

**Задачы выхавання і развіцця асобы вучня:** стварыць умовы для фарміравання цікавасці і павагі да асобы пісьменніка; развіцця аналітычнага мыслення вучняў, навыкаў слухання і канспектавання; садзейнічаць выхаванню чытацкай і маўленчай культуры вучняў.

**Тып урока:** урок тлумачэння новага матэрыялу.

**Абсталяванне:** падручнік ”Беларуская літаратура 9 клас“ пад рэдакцыяй В.У. Праскаловіч, тэкст твора ”Пінская шляхта“, прэзентацыя, фотаздымкі да твора.

**Ход урока**

**I.Арганізацыйна-матывацыйны этап**

1.Стварэнне псіхалагічнага настрою.

- Кажуць, што добры настрой - палова поспеху. Усміхнёмся і пажадаем адзін аднаму творчай працы на ўроку.

2.Афарызмы Дуніна-Марцінкевіча(*вывешваюцца на дошцы*):

Бараніць родны край – гэта рыцараў справа!

Што зрабіў дабро, душа мая рада.

Хто ў Бога верыць, той не ашуканы.

- Пра што могуць расказаць гэтыя афарызмы? Якім вы ўяўляеце сабе чалавека, што так казаў? (*Чалавек займаў актыўную жыццёвую і грамадзянскую пазіцыю.*)

- З гэтым чалавекам мы сёння з вамі пазнаёмімся. Звярніце ўвагу на партрэт (слайд 2, прыём візуалізацыі ”Дэкадзіраванне фотакадраў“). Вы бачыце Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Гэта менавіта ён сказаў дадзеныя

крылатыя фразы. Але шмат чаго пра чалавека можа сказаць і яго знешнасць. Уважліва разгледзьце партрэт. Пабудзьце крыху псіхолагамі. Як бы вы апісалі чалавека па гэтым партрэце? (*Разважанні вучняў.*) Звернемся да падручніка ( с.74 пыт.5) і зачытаем апісанне знешнасці Дуніна-Марцінкевіча, якое даваў пісьменнік Уладзімір Караткевіч у рамане ”Каласы пад сярпом тваім“. (*Усё зводзіцца да таго, што гэты чалавек сціплы, добры.*)

<u>Прыём візуалізацыі ”Кросэнс“</u>

- А зараз уважліва разгледзьце наступныя малюнкі і паспрабуйце вызначыць тэму нашага ўрока (слайды 3, 4).

**ІІ.Паведамленне тэмы ўрока і пастаноўка задач** (*задачы вучні фармулююць самі па апорных словах)*

Пазнаёмімся …

Даведаемся ….

Урокі жыцця ад … (*прымацоўваюцца на дошцы*)

**ІІІ. Інфармацыйна-пошукавы этап**

- Дык хто ж ён наш Дунін-Марцінкевіч? Я прапаную вам паглядзець відэаролік (<u>прыём візуалізацыі</u>). У час прагляду пазначце для сябе, чым было адметнае жыццё пісьменніка. Гэта не пэўныя біяграфічныя шаблоны: нарадзіўся, вучыўся і г.д., а менавіта яго актыўную грамадзянскую пазіцыю.

**youtube.com**›watch?v=NzDAnbltnPA

<u>Прыём візуалізацыі ”Кластар”(</u>слайд 6)

На дошцы складаецца кластар “Асоба Дуніна-Марцінкевіча”

- заснавальнік беларускай драматургіі;
- прыхільнік паўстання1863-1864гг.;
- заснавальнік нацыянальнага тэатра (1851г.,Мінск);
- заснавальнік прыватнай школы(1876г.,Люцынка).

- Дарэчы, школа існавала нелегальна. Наведваў яе і будучы пісьменнік Я.Ш (Антон Лявіцкі).

-Твор, з якім мы распачнём працу, называецца ”Пінская шляхта“. Мажліва, з назвы нам трэба патлумачыць значэнне слова шляхта. Прыгадайце з гісторыі, хто такая шляхта? Пра якую шляхту апавядае нам пісьменнік? (*міжпрадметныя сувязі, разважанні вучняў*)

- Твор адносіцца да жанру камедыі. ( Камедыя — адзін з жанраў драмы і кіно, у якім характары, дзеянні, з’явы паказваюцца праз прызму камічнага. Камедыя высмейвае негатыўныя з’явы сацыяльнага жыцця, заганы чалавечага характару, з дапамогай смеху сцвярджае станоўчы ідэал). Сам аўтар канрэтызуе яе від і называе фарс-вадэвілем.

- Звярніцеся да слоўніка літаратуразнаўчых тэрмінаў і пазнаёмцеся з вызначэннем тэрмінаў вадэвіль (с.265) і фарс (с.271). Якія прыметы гэтых жанраў вы можаце адзначыць у творы? (*разважанні вучняў*)

- Драматычныя творы прызначаны для таго, каб іх ставілі на тэатральных падмостках. Калі бываеце ў Віцебску ці Мінску і ідзяце каля драматычных тэатраў, вы бачыце афішы тэатральных пастановак. І ваша вока можа выхапіць з гэтай афішы нешта тое , што вас зацікавіць. Паглядзіце на афішы да п’есы ”Пінская шляхта“ (слайд 7, прыём візуалізацыі ”Дэкадзіраванне фотакадраў“). Якія афішы, на вашу думку, найбольш яскрава адлюстроўваюць сутнасць п’есы? (*разважанні вучняў)*

-У драматычным творы на самым пачатку ідзе пералік усіх дзеючых асоб. Як вы думаеце, з якой мэтай гэта робіцца? Давайце звернем увагу на імёны і прозвішчы нашых герояў (слайд 8). Пра што яны вам гавораць? (*разважанні вучняў*)

- Зараз мы з вамі папрацуем з кампазіцыяй твора ”Пінская шляхта“. Толькі зробім гэта крыху іншым спосабам. Я прапаную вам фотаздымкі са сцэн спектакля (слайд 9, яны ж вывешваюцца і на дошцы). Вы людзі 21 стагоддзя, што жывуць інтэрнэтам. Скажыце мне, калі ласка, што такое хэштэг? (Хэштэг (англ. hashtag – размечаная метка) простымі словамі – гэта слова са значком #, якое гаворыць, пра што публікацыя. Яно раздзяляе кантэнт па тэмах).

- Вам трэба прыдумаць свае хэштэгі да пэўных сцэн твора і запісаць іх на сцікерах.

**IV.Творчасць**

Прыём візуалізацыі ”Дэкадзіраванне фотакадраў” (заданне для мацнейшых, астатнія перачытваюць першую з’яву твора). (Тэкст выводзіцца на слайд 10 для тых, у каго няма кніг.)

Агучванне работ (*работы вывешваюцца на дошцы*).

- Кандрат Крапіва ў сваёй аднайменнай працы па літаратуразнаўстве падкрэсліваў: ”Канфлікт - аснова п’есы“. Прыгадайце першую з’яву твора. Чаму менавіта так пачынаецца твор? (*развалжанні вучняў*)

- А зараз яшчэ раз звернем увагу на вашы хэштэгі да фотакадраў. Вы самі вызначылі канфлікт, які пакладзены ў аснову п’есы. Прычым, мы бачым, што гэтых канфліктаў два: сямейна-бытавы і сацыяльна-грамадскі (слайды 12,13,14).

**V. Падагульненні па ўроку**

- Падводзім вынік нашага ўрока. Зараз мы з вамі можам запоўніць пэўныя акенцы пантбука ( шаблоны рыхтаваліся загадзя, прыём візуалізацыі ”Пантбук“).

**VI.Рэфлексія**

Звярнуцца да задач , якія ставіліся на пачатку ўрока.

- Урокі ад Дуніна-Марцінкевіча…. (слайд 11)

**VII. Дамашняе заданне**

Падрыхтаваць характарыстыкі вобразаў шляхты (выкарыстаць кругі Эйлера, індывідуальныя заданні, слайды 15,16 ) і чыноўніцтва , запоўніць пантбук па творы ( слайды 17-24).